«**Каляндар знамянальных і памятных дат на 2021 год**» утрымлівае асноўныя раздзелы:

1. ***«Даты беларускага і краязнаўчага календара»:*** уключаны юбілеі рэспубліканскага значэння ў галіне літаратуры і мастацтва; юбілеі знакавых падзей, дзеячаў, жыццё або дзейнасць якіх звязаны з Брэстчынай; дзяржаўныя, агульнарэспубліканскія, абласныя памятныя даты; рэлігійныя святы.
2. ***«Даты российского и зарубежного календаря»:*** уключаны найбольш значныя даты расійскага і сусветнага календара; юбілеі паэтаў, пісьменнікаў, літаратуразнаўцаў, а таксама найбольш вядомых дзеячаў мастацтва, палітыкі і грамадства.
3. ***«Книги-юбиляры».***

Выкарыстаная літаратура:

Беларускі каляндар, 2021 год // Новыя кнігі: па старонках беларускага друку. – 2020. – № 8. – Дадатак (студзень – май) ; № 9. – Дадатак (чэрвень – снежань).

Знаменательные даты, 2016 : универсальный энциклопедический календарь-журнал : для работников библиотек, школ и вузов, учреждений науки и культуры, любителей искусства и словесности. – Москва : Журнал «Библиотека», 2015. – 752 с.

Календарь знаменательных и памятных дат по истории Брестской области на 2021 год / составитель Н. С. Хилько. – Брест : Учреждение «Государственный архив Брестской области», 2020. – 23 с.

Каляндар знамянальных і памятных дат на 2016 год / УК «Абласная бібліятэка імя М. Горкага», Аддзел бібліятэказнаўства. – Брэст : [б. в.], 2015. – 48 с.

Літаратурная карта Берасцейшчыны / рэд. і ўклад. А. Крэйдзіч. – Брэст : Брэсцкая друкарня, 2008. – 567 с.

Мастакі Брэстчыны : каталог / Грамадскае аб’яднанне «Беларускі саюз мастакоў» ; [складальнік П. А. Рабаў ; прадмова: П. А. Рабаў, П. Васілеўскі]. – Брэст : Брэсцкая друкарня, 2019. – 107 с.

Творчы партрэт пісьменніцкай суполкі : біябібліяграфічны даведнік Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі / [складальнік Н. М. Парчук ; пад рэдакцыяй Т. А. Дземідовіч]. – Брэст : Альтернатива, 2018. – 175 с.

Таксама выкарыстана інфармацыя з сайтаў, размешчаных у сетцы Internet, у т. л. БД «Беларусь у асобах і падзеях» (інтэрнэт-партал Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі), і аўтарытэтныя запісы НББ.

# ДАТЫ БЕЛАРУСКАГА І КРАЯЗНАЎЧАГА КАЛЕНДАРА

***У 2021 ГОДЗЕ СПАЎНЯЕЦЦА:***

**920** гадоў з дня нараджэння **ЕФРАСІННІ (ЕЎФРАСІННІ) ПОЛАЦКАЙ** (свец. імя ПРАДСЛАВА; каля 1101 ці 1104, г. Полацк, Полацкае княства – 1173), полацкай князёўны, асветніцы і мецэнаткі, заснавальніцы жаночага і мужчынскага манастыроў, першай жанчынай гэтага гістарычнага перыяду, кананізаванай у святыя

**860** гадоў з часу стварэння **КРЫЖА ЕФРАСІННІ ПОЛАЦКАЙ**, унікальнага твора старабеларускага эмальернага мастацтва, рэлігійнай і духоўнай святыні беларусаў (1161)

**745** гадоў з часу заснавання г. **КАМЯНЦА** (Брэсцкая вобл.; 1276)

**745** гадоў з пачатку будавання **КАМЯНЕЦКАЙ ВЕЖЫ**, помніка абарончага дойлідства, унесенага ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (Камянец; 1276)

**575** гадоў з часу стварэння **БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКАГА ЛЕТАПІСУ 1446**, першага агульнадзяржаўнага летапіснага зводу Вялікага Княства Літоўскага (1446)

**455** гадоў з часу існавання **БЕРАСЦЕЙСКАГА ВАЯВОДСТВА**, адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі ў Вялікім Княстве Літоўскім (1566–1795)

**455** гадоў з часу ўпамінання ў пісьмовых крыніцах **в. РЫТА МАЛАЯ (суч. г. МАЛАРЫТА**; 1566)

**430** гадоў з часу зацвярджэння **НІКОЛЬСКАГА ПРАВАСЛАЎНАГА БРАЦТВА** і адкрыцця першай брацкай школы (Брэст; 1591)

**425** гадоў з часу выдання **«АЗБУКІ» ЛАЎРЭНЦІЯ ЗІЗАНІЯ**, першага на Беларусі і Украіне буквара (1596)

**370** гадоў з дня нараджэння **ІЛЛІ ФЁДАРАВІЧА КАПІЕВІЧА (КАПІЕЎСКАГА;** 1651, Брэстчына ці Міншчына – 1714), асветніка, перакладчыка, выдаўца, літаратара

**225** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА МІХАЙЛАВІЧА БАГАТКЕВІЧА** (1796, Віцебская губ. – 1831[?]), кнігазнаўца, бібліятэкара, бібліёграфа, педагога

**220** гадоў з дня нараджэння **ТАМАША КУРГАНОВІЧА** (1801, Брэст – 1865), педагога, мовазнаўца

**200** гадоў з дня нараджэння **ДЖУЗЭПЭ АХІЛА ЭЛЬМІРА** (АХІЛЕСА ЮЗАФА) **БАНОЛЬДЗІ** (1821–1871), грамадскага дзеяча, спевака, танцмайстара

**200** гадоў з дня нараджэння **КСЕНАФОНТА АНТОНАВІЧА ГАВОРСКАГА** (1821–1871), вучонага-гісторыка, археолага, выдаўца

**200** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА МАКСІМАВІЧА СЕМЯНТОЎСКАГА (СЕМЯНТОЎСКАГА-КУРЫЛЫ**; 1821–1893), расійскага і беларускага археолага, краязнаўца, этнографа, складальніка кнігі «Беларускія старажытнасці»

**200** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА АНДРЭЕВІЧА СТАНКЕВІЧА** (у манастве **АНАТОЛІЯ;** 1821, Міншчына – 1903), праваслаўнага царкоўнага дзеяча Беларусі, гісторыка, публіцыста

**180** гадоў з пачатку выдання польскамоўнага часопіса **«АТЭНЭУМ»**, які асвятляў праблемы гісторыі, культуры, грамадска-палітычнага жыцця зямель былога ВКЛ (Вільня; 1841–1851)

**180** гадоў з часу пабудавання **КАРАЛЕЎСКАГА КАНАЛА** (1841)

**170** гадоў з дня нараджэння **ІВАНА ПАЎЛАВІЧА АЗЁМШЫ** (АЗЕМШЫ; 1851, Петрыкаўскі р-н – 1916), беларускага народнага казачніка

**160** гадоў з дня нараджэння **ФРАНЦІШКА БРУЗДОВІЧА** (1861, Іванаўскі р-н – 1912), мастака ў галіне станковага і дэкаратыўна-прыкладнога жывапісу

**135** гадоў з часу пабудавання **БРЭСЦКАГА ЧЫГУНАЧНАГА ВАКЗАЛА**, помніка архітэктуры рэтраспектыўна-рускага стылю, унесенага ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (Брэст; 1886)

**135** гадоў з дня нараджэння **КАСЬЯНА ВЯСЁЛАГА** (сапр. **ВІКЕНЦІЯ ІОСІФАВІЧА АЎДЗЕЯ**; 1886 ці 1891, Вілейскі пав. – 1916), пісьменніка, аўтара вершаў, апавяданняў, нататкаў

**125** гадоў з пачатку дзейнасці першай у Беларусі **ТЭЛЕФОННАЙ СТАНЦЫІ** агульнага карыстання (Мінск; 1896)

**100** гадоў з часу адкрыцця **ДЗЯРЖАЎНАЙ ГІМНАЗІІ** ў г. Пінску (1921)

**100** гадоў з часу адкрыцця **ДЗЯРЖАЎНАЙ ГІМНАЗІІ** імя караля Уладзіслава Ягеллы ў г. Лунінцы (1921)

**100** гадоў з часу адкрыцця **БЕЛАРУСКАГА МУЗЕЯ ІМЯ І. ЛУЦКЕВІЧА Ў ВІЛЬНІ**, адной з навуковых і асветніцкіх установў у гісторыі Беларусі (1921–1945)

**85** гадоў з дня нараджэння **ДЗМІТРЫЯ МІКАЛАЕВІЧА КРАЎЧУКА** (1936; Пружанскі р-н), вучонага-геафізіка, матэматыка

**75** гадоў з пачатку выдання дзяржаўнага (нацыянальнага) бібліяграфічнага паказальніка **«БЕЛАРУСЬ У СУСВЕТНЫМ ДРУКУ»** (Мінск; 1946)

**75** гадоў з часу стварэння **ААТ «БРЭСТСЕЛЬМАШ»**, аднаго з вядучых вытворцаў спецыяльнага абсталявання для сельскай гаспадаркі (Брэст; 1946)

**75** гадоў з часу стварэння **ПІНСКАЙ ФАБРЫКІ МАСТАЦКІХ ВЫРАБАЎ «КРЫНІЦА ПАЛЕССЯ»**, рэспубліканскага ўнітарнага вытворчага прадпрыемства (Пінск; 1946)

**75** гадоў з часу стварэння **ПІНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА АГРАРНА-ТЭХНІЧНАГА КАЛЕДЖА ІМЯ А. Я. КЛЯШЧОВА** (Пінск; 1946)

**70** гадоў з часу ўтварэння **БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКАГА СУМЕСНАГА ПРАДПРЫЕМСТВА «БРЭСТГАЗААПАРАТ»**, ААТ, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці (Брэст; 1951)

**65** гадоў з часу заснавання **ПІНСКАГА ДОСЛЕДНА-МЕХАНІЧНАГА ЗАВОДА**, ААТ, прадпрыемства па вытворчасці станкоў, механізмаў, насосаў, металаформаў і іншых вырабаў (Пінск; 1956)

**50** гадоў з часу заснавання **БЕЛАРУСКАЙ БІБЛІЯТЭКІ І МУЗЕЯ ІМЯ ФРАНЦІШКА СКАРЫНЫ Ў ЛОНДАНЕ** (1971)

**45** гадоў з часу стварэння **ДАВЫД-ГАРАДОЦКАГА ЭЛЕКТРАМЕХАНІЧНАГА ЗАВОДА**, ААТ, прадпрыемства па вытворчасці бытавых электрычных машын і прылад (Столінскі р-н, 1976)

**25** гадоў з часу правядзення міжнароднага фестывалю духавой музыкі «**БЕЛАРУСКІЯ ФАНФАРЫ**» (Баранавічы; 1996)

**25** гадоў з пачатку выдання навукова-папулярнага, даведачнага, нарматыўнага вытворча-практычнага часопіса **«БІБЛІЯТЭЧНЫ СВЕТ»** (Мінск; 1996)

**25** гадоў з часу заснавання навукова-метадычнага і публіцыстычнага часопіса **«ВЫШЭЙШАЯ ШКОЛА»** (Мінск; 1996)

**25** гадоў з пачатку правядзення фестывалю-кірмашу працаўнікоў вёскі **«ДАЖЫНКІ»** (1996)

## *СТУДЗЕНЬ*

**100** гадоў з часу заснавання дзяржаўнага выдавецтва **«БЕЛАРУСЬ»**, РУП (Мінск; 1921)

**60** гадоў з пачатку дзейнасці **БЯРОЗАЎСКАГА КАМБІНАТА СІЛІКАТНЫХ ВЫРАБАЎ**, ААТ (Бяроза; 1961)

**40** гадоў з часу ўтварэння **БРЭСЦКАГА АБЛАСНОГА АДДЗЯЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ** (1981)

1 **НОВЫ ГОД**

1 **160** гадоў з дня нараджэння **ЯЎХІМА ФЁДАРАВІЧА КАРСКАГА** (1861, Гродзенскі р-н – 1931), філолага-славіста, заснавальніка беларускага навуковага мовазнаўства і літаратуразнаўства, этнографа, фальклараста, палеографа, педагога, акадэміка Пецярбургскай АН

1 **100** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА ПРАКОПАВІЧА БЕЛАВУСАВА** (1921, Шумілінскі р-н – 2006), мастака кіно, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1974)

1 **85** гадоў з дня нараджэння **АНАТОЛЯ ПАЎЛАВІЧА КУДРАЎЦА** (1936, Клічаўскі р-н – 2014), пісьменніка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1986)

1 **65** гадоў з дня нараджэння **ГАЛІНЫ СТАНІСЛАВАЎНЫ ГАРАДКО** (1956, Ляхавіцкі р-н), аўтара шматлікіх вучэбна-метадычных дапаможнікаў па беларукай літаратуры

1 **60** гадоў з часу адкрыцця **БРЭСЦКАЙ АБЛАСНОЙ ДЗІЦЯЧАЙ БІБЛІЯТЭКІ** (суч. аддзел літаратуры для дзяцей і юнацтва УК «Брэсцкая абласная бібліятэка імя М. Горкага»; Брэст; 1961–1987)

2 **85** гадоў з дня нараджэння **АНТОНА РЫГОРАВІЧА НАВУМАЎЦА** (1936, Пінскі р-н), украінскага вучонага-фізіка, акадэміка НАН Украіны, заслужанага дзеяча навукі і тэхнікі Украіны, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР (1988) і Украіны (1997)

2 **80** гадоў з дня нараджэння **МІХАСЯ (МІХАІЛА МІКАЛАЕВІЧА) ЗАРЭМБЫ** (1941, Лагойскі р-н – 2002), пісьменніка, перакладчыка

3 **ДЗЕНЬ БАНКАЎСКАГА І ФІНАНСАВАГА РАБОТНІКА** (першая нядзеля студзеня)

3 **200** гадоў з дня нараджэння **МІХАІЛА СЯРГЕЕВІЧА БАШЫЛАВА** (1821, Жлобінскі р-н – 1870), мастака, ілюстратара

3 **80** гадоў з дня нараджэння **СЦЯПАНА ПАЎЛАВІЧА НЕФІДОВІЧА** (1941, Лунінецкі р-н), паэта

3 **75** гадоў з дня нараджэння **ТАДЭВУША ІГНАЦЬЕВІЧА КАНДРУСЕВІЧА** (1946, Гродзенскі р-н), дзеяча Рымска-Каталіцкага Касцёла ў Беларусі, арцыбіскупа, мітрапаліта Мінска-Магілёўскага

3 **70** гадоў з дня нараджэння **ВАЛЯНЦІНЫ МІХАЙЛАЎНЫ КУКСА** (1951, Іванаўскі р-н – 2014), пісьменніцы

5 **ДЗЕНЬ РАБОТНІКАЎ САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ**

7 **РАСТВО ХРЫСТОВА** (праваслаўнае Раство)

8 **130** гадоў з дня нараджэння **БРАНІСЛАВЫ ФАМІНІЧНЫ НІЖЫНСКАЙ** (1891, г. Мінск – 1972), расійскай танцоўшчыцы, балетмайстра, педагога, аднаго з рэфарматараў харэаграфіі ХХ ст.

8 **85** гадоў з дня нараджэння **ГЕНАДЗЯ АЛЯКСАНДРАВІЧА КАХАНОЎСКАГА** (1936, Маладзечанскі р-н – 1994), вучонага-гісторыка, археолага, краязнаўца, фалькларыста, літаратуразнаўца, аўтара шэрага літаратурна-краязнаўчых нарысаў, кніг па гісторыі гарадоў Беларусі

9 **130** гадоў з дня нараджэння **НАВУМА БАРЫСАВІЧА (НОХУМА БОРУХАВІЧА) ЛОЙТАРА** (1891–1966), рэжысёра, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР (1946)

11 **100** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА АЛЯКСАНДРАВІЧА БЯЛОВА** (1921, Расія – 1985), акцёра, заслужанага артыста Беларусі (1977)

12 **440** гадоў з часу атрымання **г. ПІНСКАМ** граматы на

Магдэбургскае права (1581)

12 **80** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА ГЕОРГІЕВІЧА МУЛЯВІНА** (1941, Расія – 2003), артыста эстрады, кампазітара, стваральніка і мастацкага кіраўніка Беларускага дзяржаўнага ансамбля «Песняры», народнага артыста Беларусі і СССР, заслужанага дзеяча культуры Польшчы, лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1976), кавалера ордэна Ф. Скарыны

12 **70** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСЕЯ МІХАЙЛАВІЧА ЛІТВІНА** (1951, Столінскі р-н), вучонага-гісторыка

15 **100** гадоў з пачатку выхаду газеты **«БЕЛАРУСКАЯ НІВА»** (Мінск; 1921)

15 **85** гадоў з дня нараджэння **ЯНКІ (ІВАНА ДАНІЛАВІЧА) СІПАКОВА** (1936, Аршанскі р-н – 2011), пісьменніка, перакладчыка, заслужанага дзеяча культуры Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы (1976)

15 **70** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ МІКАЛАЕВІЧА КАЛІНКОВІЧА** (сапр. **КАЛЯНКОВІЧА;** 1951, Лунінецкі р-н – 1990), пісьменніка, літаратуразнаўца, крытыка, публіцыста, даследчыка беларуска-рускіх, беларуска-туркменскіх літаратурных сувязей, уладальніка шэрага ўрадавых узнагарод

16 **195** гадоў з дня нараджэння **РАМУАЛЬДА ЛЮДВІКАВІЧА ТРАЎГУТА** (1826, Камянецкі р-н – 1864), ваеннага дзеяча, генерала, аднаго з кіраўнікоў паўстання 1863–1864 гг. у Беларусі і Польшчы

16 **30** гадоў з пачатку выдання газеты **«ПРЕССБОЛ»** (Мінск; 1991)

17–18 **95** гадоў з часу правядзення **ПЕРШАГА З'ЕЗДУ ДАСЛЕДЧЫКАЎ БЕЛАРУСКАЙ АРХЕАЛОГІІ І АРХЕАГРАФІІ** (Мінск; 1926)

18 **85** гадоў з дня нараджэння **ВАСІЛЯ СЯРГЕЕВІЧА СЁМУХІ** (1936, Пружанскі р-н), перакладчыка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1992)

18 **60** гадоў з дня нараджэння **ВАЛЕРЫЯ ЯЎГЕНАВІЧА КАВАЛЬЧУКА** (1961, Брэст), жывапісца, педагога

19 **90** гадоў з дня нараджэння **НАТАЛЛІ МІКАЛАЕЎНЫ ПАПЛАЎСКАЙ** (1931, Расія), мастачкі, лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1970)

21 **65** гадоў з дня нараджэння **МАРЫІ БРАНІСЛАВАЎНЫ КНЯЗЕВАЙ** (1956, г. Мінск – 2018), мастака дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (мастацкае шкло), жывапісца

24 **90** гадоў з дня нараджэння **МІХАСЯ (МІХАІЛА ІОСІФАВІЧА) МУШЫНСКАГА** (1931, Быхаўскі р-н), літаратуразнаўца, тэкстолага, крытыка, члена-карэспандэнта НАН Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1980)

24 **80** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА АЛЯКСАНДРАВІЧА АЛОНЦАВА** (1941, г. Брэст – 2013), мастака, аўтара прац у станковай графіцы, акварэлі, педагога

24 **70** гадоў з дня нараджэння **МІХАСЯ (МІХАІЛА ПАЎЛАВІЧА) ПАЗНЯКОВА** (1951, Быхаўскі р-н), пісьменніка, многія вершы якога пакладзены на музыку, перакладчыка, мовазнаўца, журналіста

24 **70** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА МІХАЙЛАВІЧА ХОМІЧА** (1951, Камянецкі р-н), вучонага-юрыста, заслужанага юрыста Беларусі

28 **240** гадоў з дня нараджэння **ЮЗАФА ДАШЧАНСКАГА** (1781, г. Вільня – 1844), піяніста, кампазітара, дырыжора, педагога

28 **105** гадоў з дня нараджэння **ПАЎЛА ВАСІЛЬЕВІЧА ПРАНЯГІНА** (1916–1997), удзельніка партызанскага руху на тэрыторыі Брэсцкай вобласці падчас Вялікай Айчыннай вайны

29 **65** гадоў з дня нараджэння **ТАМАРЫ УЛАДЗІМІРАЎНЫ ДЗЯНІСАВАЙ** (1956, Гомельская вобл.), мастачкі

29 **30** гадоў з часу заснавання **АКАДЭМІІ КІРАВАННЯ ПРЫ ПРЭЗІДЭНЦЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**, дзяржаўнай вышэйшай навучальнай установы па падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы і павышэнні кваліфікацыі кадраў органаў дзяржаўнага кіравання, кіруючых кадраў і спецыялістаў народнай гаспадаркі (Мінск; 1991)

30 **100** гадоў з дня нараджэння **ІВАНА ПЯТРОВІЧА ШАМЯКІНА** (1921, Добрушскі р-н – 2004), народнага пісьменніка Беларусі, дзяржаўнага і грамадскага дзеяча, акадэміка НАН Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР (1951), Літаратурнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1959), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1968, 1982), Літаратурнай прэміі Міністэрства абароны СССР (1978), Прэміі Саюзнай Дзяржавы Беларусі і Расіі (2002)

31 *(апошняя нядзеля студзеня)* **ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАЙ НАВУКІ**

31 **125** гадоў з дня нараджэння **СОФ’І АЛЯКСАНДРАЎНЫ ЯНОЎСКАЙ** (дзяв. НЕЙМАРК; 1896, г. Пружаны – 1966), расійскага вучонага-філосафа, педагога, логіка і матэматыка, стваральніцы савецкай школы філасофіі матэматыкі, удзельніцы грамадзянскай вайны, узнагароджанай ордэнам Леніна

## *ЛЮТЫ*

**50** гадоў з часу стварэння **БРЭСЦКАГА КАМБІНАТА БУДАЎНІЧЫХ МАТЭРЫЯЛАЎ**, ААТ (Брэст; 1971)

1 **75** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА МАІСЕЕВІЧА ЛІЎШЫЦА** (1946, Расія), літаратуразнаўца, публіцыста, педагога, гісторыка, этнографа

2 **485** гадоў з дня нараджэння **ПЯТРА СКАРГІ (ПАВЕНСКАГА;** 1536, Польшча – 1612), царкоўнага і палітычнага дзеяча Рэчы Паспалітай, пачынальніка польскай аратарскай прозы, заснавальніка і першага рэктара Віленскай езуіцкай акадэміі (цяпер Віленскі

універсітэт)

4 **100** гадоў з пачатку дзейнасці **ПАЛЕСКАГА ВАЯВОДСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ**, адміністратыўнага органа ўлады на тэрыторыі Палескага ваяводства (1921)

7 **475** гадоў з дня нараджэння **ФЁДАРА МІХАЙЛАВІЧА ЕЎЛАШОЎСКАГА (ЕЎЛАШЭЎСКАГА;** 1546, г. Ляхавічы – пасля 1616 ці 1619), грамадскага дзеяча, пісьменніка-мемуарыста

7 **140** гадоў з дня нараджэння **РАМУАЛЬДА АЛЯКСАНДРАВІЧА ЗЯМКЕВІЧА** (1881, Польшча – 1943 ці 1944), бібліёграфа, этнографа, гісторыка беларускай літаратуры

7–11 **95** гадоў з часу правядзення **ПЕРШАГА ЎСЕБЕЛАРУСКАГА КРАЯЗНАЎЧАГА З'ЕЗДУ** (Мінск; 1926)

7 **55** гадоў з часу адкрыцця **БРЭСЦКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ПАЛІТЭХНІЧНАГА КАЛЕДЖА**, філіяла ўстановы адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт» (Брэст; 1966)

8 **135** гадоў з дня нараджэння **ВАСІЛЯ ДАНІЛАВІЧА ДРУШЧЫЦА (ДРУЖЧЫЦА;** 1886, Бярозаўскі р-н – 1937), вучонага-гісторыка, даследчыка гісторыі Беларусі, правадзейнага члена Інстытута беларускай культуры, педагога

8 **100** гадоў з дня нараджэння **ІВАНА ПАЎЛАВІЧА МЕЛЕЖА** (1921, Хойніцкі р-н – 1976), пісьменніка, грамадскага дзеяча, народнага пісьменніка Беларусі, лаўрэата Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа (1962), Ленінскай прэміі (1972), Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1976)

9 **120** гадоў з дня нараджэння **ВІКТАРА ПАЎЛАВІЧА ПУГАНАВА** (1901, Расія – 1941), удзельніка абароны Брэста ў Вялікую Айчынную вайну, генерал-маёра

9 **70** гадоў з дня нараджэння **ВІКТАРА АНАТОЛЬЕВІЧА ФЯДОСІКА** (1951, Лунінецкі р-н), вучонага-гісторыка, лаўрэата прэміі БДУ імя акадэміка У. І. Пічэты (2003), узнагароджанага медалём Свяціцеля Кірылы Тураўскага Беларускай Праваслаўнай Царквы (2006), выдатніка адукацыі Беларусі (2009)

10 **70** гадоў з дня нараджэння **МАРЫІ ПЯТРОЎНЫ ЖЫГАЛАВАЙ** (1951, Маларыцкі р-н), літаратуразнаўца, метадыста, навукоўца, заслужанага настаўніка Беларусі

12 **275** гадоў з дня нараджэння **АНДРЭЯ ТАДЭВУША БАНАВЕНТУРЫ КАСЦЮШКІ** (ахрышчаны 12.02.1746, Івацэвіцкі р-н – 1817), дзяржаўнага і ваеннага дзеяча Рэчы Паспалітай, генерал-лейтэнанта, кіраўніка нацыянальна-вызваленчага паўстання 1794 г. у Польшчы, Беларусі і Літве, удзельніка вайны за незалежнасць ЗША

12 **90** гадоў з дня нараджэння **ПАЎЛА НЕСЦЕРАВІЧА ПАНАСЮКА** (1931), дырэктара Мемарыяльнага комплекса «Брэсцкая крэпасць-герой» (1981–1996), старшыні савета ветэранаў Ленінскага р-на г. Брэста (2002–2014)

14 **65** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА ІВАНАВІЧА ЯГОЎДЗІКА (ЯГАЎДЗІКА**; 1956, Слонімскі р-н), пісьменніка, драматурга, літаратурнага крытыка, перакладчыка, лаўрэата прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (1993), Літаратурнай прэміі імя Я. Маўра (1994)

15 **ДЗЕНЬ ПАМЯЦІ ВОІНАЎ-ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІСТАЎ**

15 **125** гадоў з дня нараджэння **ВАЛЯР'ЯНА ВАЛЯР'ЯНАВІЧА КАЛІНОЎСКАГА** (1896, Расія – 1941), артыста оперы (барытон), заслужанага артыста Беларусі

15 **120** гадоў з дня нараджэння **СЯРГЕЯ АНТОНАВІЧА БАБРУКА** (1901, Пружанскі р-н – 1962), ваеннага дзеяча, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны, генерал-лейтэнанта інжынерна-тэхнічнай службы, Героя Савецкага Саюза (1944)

15 **90** гадоў з дня нараджэння **ГЕОРГІЯ ГЕОРГІЕВІЧА ПАПЛАЎСКАГА** (1931, Украіна – 2017), графіка, жывапісца, народнага мастака Беларусі, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, акадэміка НАН Беларусі і Расійскай Акадэміі мастацтваў, лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1970), Міжнароднай прэміі імя Дж. Неру (1974), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2002), прэміі Саюзнай дзяржавы (2012)

17 **80** гадоў з дня нараджэння **КАСТУСЯ (КАНСТАНЦІНА ФЁДАРАВІЧА) ЖМІНЬКО** (г. Брэст, 1941), паэта

17 **70** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА ДЗМІТРЫЕВІЧА ТУЛУПАВА** (1951, г. Брэст), мастака

17 **60** гадоў з дня нараджэння **КАНСТАНЦІНА ГАЎРЫЛАВІЧА ВАШЧАНКІ** (1961, Малдова), графіка, лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва (2016)

17 **35** гадоў з часу стварэння **ААТ «БРЭСТМАШ»** (Брэст; 1986)

19 **100** гадоў з дня нараджэння **ЯРАСЛАВА АНТОНАВІЧА ВАШЧАКА** (1921, Украіна – 1989), дырыжора, народнага артыста СССР, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1990)

21 **35** гадоў з часу стварэння **РУЖАНСКАЙ ПУШЧЫ**, біялагічнага заказніка рэспубліканскага значэння (Пружанскі р-н; 1986)

23 **ДЗЕНЬ АБАРОНЦАЎ АЙЧЫНЫ І ЎЗБРОЕНЫХ СІЛ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

23 **130** гадоў з дня нараджэння **МІХАЙЛА (МІХАІЛА МІКАЛАЕВІЧА) ПІЯТУХОВІЧА** (1891, Сенненскі р-н – 1937), крытыка, літаратуразнаўца, педагога, заснавальніка беларускай літаратурнай крытыкі, правадзейнага члена Інбелкульта

24 **100** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА ЯКАЎЛЕВІЧА КАРПАВА** (1921, Расія – 2011), рэжысёра, заслужанага дзеяча культуры Беларусі

28 **55** гадоў з дня нараджэння **АЛЕСЯ (АЛЯКСАНДРА МІКАЛАЕВІЧА) БАДАКА** (1966, Ляхавіцкі р-н), паэта, празаіка, публіцыста, літаратурнага крытыка, галоўнага рэдактара часопіса

«Полымя» (з 2014), лаўрэата рэспубліканскай літаратурнай прэміі «Залаты Купідон» (2008), Міждзяржаўнай прэміі СНД «Зоркі Садружнасці» (2014)

## *САКАВІК*

| | |
|---|---|
| | **30** гадоў з часу заснавання **МАШЫНАБУДАЎНІЧАГА ПРАДПРЫЕМСТВА «КОМПО»**, ТАА, лаўрэата Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці 2011 г. (Брэст; 1991) |
| **1** | **95** гадоў з дня нараджэння **БАРЫСА ВАСІЛЬЕВІЧА СТРАЛЬЦОВА** (1926, Быхаўскі р-н – 2009), журналіста, літаратуразнаўца, пісьменніка, педагога, выдатніка адукацыі Беларусі, выдатніка друку Беларусі, заслужанага дзеяча культуры Беларусі, лаўрэата прэміі «За духоўнае адраджэнне» (2000) |
| **1** | **75** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСЕЯ СЦЯПАНАВІЧА СКАКУНА** (1946, Іванаўскі р-н), вучонага-эканаміста, дзяржаўнага і гаспадарчага дзеяча, члена-карэспандэнта НАН Беларусі, заслужанага работніка сельскай гаспадаркі Беларусі, кавалера ордэна Айчыны III ступені, ганаровага грамадзяніна Брэсцкага раёна |
| **1** | **70** гадоў з часу адкрыцця **БРЭСЦКАЙ РАЁННАЙ САНІТАРНА-ЭПІДЭМІЯЛАГІЧНАЙ СТАНЦЫІ** (сёння – ДУ «Брэсцкі занальны цэнтр гігіены і эпідэміялогіі» (1951) |
| **4** | **ДЗЕНЬ МІЛІЦЫІ** |
| **4** | **100** гадоў з дня нараджэння **ЭДУАРДА СТАНІСЛАВАВІЧА КУФКО** (1921, Цвярская вобл., Расія – 1998), жывапісца |
| **5** | **125** гадоў з дня нараджэння **КАНДРАТА КРАПІВЫ** (сапр. **КАНДРАТА КАНДРАТАВІЧА АТРАХОВІЧА**; 1896, Уздзенскі р-н – 1991), драматурга, байкапісца, празаіка, мовазнаўца, грамадскага дзеяча, акадэміка НАН Беларусі, народнага пісьменніка Беларусі, заслужанага дзеяча навукі Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР (1941, 1951, 1971), Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Янкі Купалы (1974) |
| **5** | **100** гадоў з дня нараджэння **МІХАІЛА ПАЎЛАВІЧА БЯРОЗКІ** (сапр. **МІХАІЛА ПАЎЛАВІЧА ФРАЙМАНА;** 1921, Ельскі р-н – 1992), сцэнарыста, драматурга, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі (1974) |
| **7 ці 15** | **240** гадоў з дня нараджэння **ЮЗАФА ЗАВАДСКАГА** (1781–1838), друкара, выдаўца, аднаго з заснавальнікаў выдавецкай справы |
| **7 ці 8** | **135** гадоў з дня нараджэння **УСЕВАЛАДА СЦЯПАНАВІЧА ФАЛЬСКАГА** (1886 ці 1887, г. Мінск – 1928[?]), грамадска-палітычнага, дзяржаўнага і культурнага дзеяча, акцёра, аднаго са стваральнікаў беларускага прафесійнага тэатра |
| **8** | **ДЗЕНЬ ЖАНЧЫН** |
| **10** | **75** гадоў з дня нараджэння **УЛАДЗІМІРА ВАСІЛЬЕВІЧА** |

**ГАСЦЮХІНА** (1946), акцёра, народнага артыста Беларусі, заслужанага артыста Расіі, лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола (1980), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1982), Дзяржаўнай прэміі СССР (1985), Дзяржаўнай прэміі Расіі (1993), спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2002), прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (2009), кавалера ордэна Ф. Скарыны (2011)

**11** **80** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ МІРОНАВІЧА ПЛЕСКАЦЭВІЧА** (1941, Ляхавіцкі р-н), вучонага ў галіне педагогікі, заслужанага работніка адукацыі Беларусі

**12** **50** гадоў з дня стварэння **БАТАЛЬЁНА БЕЛАРУСКІХ АРЛЯНЯТ**, грамадска-патрыятычнага руху па пошуку і ўвекавечанні памяці юных абаронцаў Радзімы ў гады Вялікай Айчыннай вайны (1971)

**14** **90** гадоў з дня нараджэння **ПАЎЛА АНДРЭЕВІЧА МІСЬКО** (1931, Слуцкі р-н – 2011), пісьменніка

**14** **60** гадоў з часу заснавання **БРЭСЦКАЙ АБЛАСНОЙ ІНСПЕКЦЫІ ПА АХОВЕ ПРЫРОДЫ** (сёння – Брэсцкі абласны камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя; 1961)

**15** **ДЗЕНЬ КАНСТЫТУЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

**18** **125** гадоў з дня нараджэння **АНТОНА КАНСТАНЦІНАВІЧА СУПІНСКАГА** (1896, Пінскі павет – 1960), фальклярыста, збіральніка беларускага фальклору, этнографа, археолага

**18** **100** гадоў з часу падпісання **РЫЖСКАГА МІРНАГА ДАГАВОРА** паміж РСФСР (таксама ад імя БССР) і УССР з аднаго боку і Польшчай з другога пра спыненне савецка-польскай вайны 1919–1920 гг. і нармалізацыі адносін (Латвія; 1921)

**19** **100** гадоў з дня нараджэння **ЮХО ІОСІФА (ЯЗЭП) АЛЯКСАНДРАВІЧ** (1921, г. Мінск – 2004), вучонага-юрыста, гісторыка права, заснавальніка навуковай школы па вывучэнні гісторыі дзяржавы і права Беларусі

**19** **90** гадоў з дня нараджэння **ГЕНАДЗЯ ВАСІЛЬЕВІЧА КІСЯЛЁВА** (1931, Расія – 2008), вучонага-гісторыка, літаратуразнаўца, пісьменніка, археографа, архівіста, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1990)

**19** **75** гадоў з дня нараджэння **ГЕНАДЗЯ ФЁДАРАВІЧА СУРМЫ** (1946, г. п. Глуск – 2002), мастака, які працаваў у станковым жывапісе і акварэлі ў жанрах пейзажа і нацюрморта

**20** **100** гадоў з дня нараджэння **БАСІ ЗАЛМАНАЎНЫ КАРПІЛАВАЙ** (дзяв. **РАЗЕНБЛАНТ;** 1921, Азербайджан – 2013), артысткі балета, заслужанай артысткі Беларусі

**20** **75** гадоў з дня нараджэння **КАНСТАНЦІНА ІВАНАВІЧА БАЛАНДЗІНА** (1946, Баранавіцкі р-н), вучонага-гісторыка, культуролага, выдатніка адукацыі Беларусі

**20** **65** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА БАРЫСАВІЧА ГАЛЬКЕВІЧА** (1956, Баранавічы), празаіка

**20** **25** гадоў з часу падпісання Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб

стварэнні **СВАБОДНАЙ ЭКАНАМІЧНАЙ ЗОНЫ «БРЭСТ»** (СЭЗ «Брэст»; 1996)

**21** **100** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСЕЯ СЦЯПАНАВІЧА ПАПОВА** (1921, Расія – 1974), мастака дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (тэкстыль)

**22** **235** гадоў з дня нараджэння **ІААХІМА ЛЯЛЕВЕЛЯ** (1786, Польшча – 1861), польскага гісторыка, грамадскага і палітычнага дзеяча, даследчыка гісторыі і культуры Вялікага Княства Літоўскага, аднаго з заснавальнікаў і рэдактараў часопіса «Tygodnik Wilen'ski»

**22** **30** гадоў з часу стварэння **НАЦЫЯНАЛЬНАГА АЛІМПІЙСКАГА КАМІТЭТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**, кіруючага органа алімпійскага руху ў Беларусі, прадстаўнічай арганізацыі Беларусі ў Міжнародным алімпійскім камітэце (1991)

**24–25** **65** гадоў з часу правядзення ў г. Брэсце **НАРАДЫ МАЛАДЫХ ПАЭТАЎ І ПРАЗАІКАЎ** (1956)

**26** **220** гадоў з дня нараджэння **КАНУТА ІВАНАВІЧА РУСЕЦКАГА** (1801, Літва – 1860), жывапісца, педагога, творчасць якога звязана з мастацкім жыццём Беларусі і Літвы, аўтара карцін на рэлігійныя тэмы

**26** **85** гадоў з дня нараджэння **ВЯЧАСЛАВА ІВАНАВІЧА БАЦЮШКО** (1936, Пінскі р-н), вучонага ў галіне будаўнічай вытворчасці, выдатніка ваеннага будаўніцтва, выдатніка вышэйшай школы СССР, педагога

**27** **170** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСЕЯ ПАРФЁНАВІЧА САПУНОВА** (1851, Віцебская губерня – 1924), гісторыка, археографа, архівіста, краязнаўца, сапраўднага члена Рускага геаграфічнага таварыства

**28** **55** гадоў з дня нараджэння **ВІНЦЭСЯ (ВЯЧАСЛАВА ВАСІЛЬЕВІЧА) ВАШЭКІ** (1966, Івацэвіцкі р-н), паэта, празаіка

**28** **25** гадоў з часу заснавання **ПАРАЛІМПІЙСКАГА КАМІТЭТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ** (Мінск; 1996)

**31** **100** гадоў з дня нараджэння **АНАТОЛЯ АБРАМАВІЧА РУДАКОВА** (1921, Расія – 1990), акцёра тэатра, заслужанага артыста Беларусі

## *КРАСАВІК*

**90** гадоў з пачатку дзейнасці **БЕЛАРУСКАГА РЭСПУБЛІКАНСКАГА ТЭАТРА ЮНАГА ГЛЕДАЧА,** заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь (Мінск; 1931)

**75** гадоў з часу стварэння **БАРАНАВІЦКАГА ЗАВОДА СТАНКАПРЫЛАД,** ААТ, спецыялізаванага прадпрыемства па выпуску тэхналагічнай аснасткі для металарэзных станкоў (Баранавічы; 1946)

**1** **70** гадоў з часу заснавання **«НАРОДНАЙ АСВЕТЫ»,** выдавецкага

рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства (Мінск; 1951)

1 **55** гадоў з часу адкрыцця **БРЭСЦКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭХНІЧНАГА УНІВЕРСІТЭТА**, буйнога навукова-вучэбнага цэнтра Беларусі (Брэст; 1966)

1 **120** гадоў з дня нараджэння **СЯРГЕЯ МІХАЙЛАВІЧА ПЯСЕЦКАГА** (1901 ці 1899, г. Ляхавічы – 1964), пісьменніка ў эміграцыі (Англія)

2 **ДЗЕНЬ ЯДНАННЯ НАРОДАЎ БЕЛАРУСІ І РАСІІ**

4 **ВЯЛІКДЗЕНЬ** (па календары каталіцкай канфесіі)

4 **125** гадоў з дня нараджэння **ПЛАТОНА АНДРЭЕВІЧА КРЭНЯ** (1896, Баранавіцкі р-н – 1962), паэта, мемуарыста, публіцыста, удзельніка Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў

5 **100** гадоў з дня нараджэння **БАРЫСА УЛАДЗІМІРАВІЧА ЭРЫНА** (1921, Расія – 2008), рэжысёра, які пэўны час быў галоўным рэжысёрам Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы і мастацкім кіраўніком Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа, заслужанага дзеяча мастацтваў Украіны (1984)

5 **80** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА МАЙСЕЕВІЧА ЮДЗІЦКАГА** (1941, г. Херсон, Украіна), пісьменніка

5 **15** гадоў з часу стварэння **ПАЛЕСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА** ў выніку рэарганізацыі Пінскага дзяржаўнага вышэйшага банкаўскага каледжа Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь (Пінск; 2006)

6 **85** гадоў з дня нараджэння **ФЁДАРА ПЯТРОВІЧА СЯНЬКО** (1936, Баранавіцкі р-н), работніка сельскай гаспадаркі, дзяржаўнага дзеяча Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі СССР (1971), Героя Сацыялістычнай Працы (1971), кавалера ордэна Леніна

6 **75** гадоў з дня нараджэння **ВАЛЯНЦІНЫ МІХАЙЛАЎНЫ КОЎТУН** (1946, Рэчыцкі р-н – 2011), пісьменніцы, крытыка, даследчыцы, лаўрэата Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова (1986)

7 **95** гадоў з часу стварэння **БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ДРУЖБЫ І КУЛЬТУРНАЙ СУВЯЗІ З ЗАМЕЖНЫМІ КРАІНАМІ**, грамадскага аб’яднання (1926)

8 **30** гадоў з часу заснавання газеты **«РЭСПУБЛІКА»** (Мінск; 1991)

9 **100** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСЕЯ АНДРЭЕВІЧА ЦАРОВА** (1921, Расія – 1978), беларускага і расійскага акцёра, заслужанага артыста Беларусі (1968)

10 **90** гадоў з дня нараджэння **ІВАНА ПЯТРОВІЧА ЧЫГРЫНА** (1931, Слонімскі р-н – 2006), літаратуразнаўца, крытыка, паэта

10 **55** гадоў з дня нараджэння **МІКОЛЫ ІЛЬЮЧЫКА** (1966, Лунінецкі р-н, Брэсцкая вобл.), паэта

12 **480** гадоў з дня нараджэння **ІПАЦІЯ ПАЦЕЯ** (свец. **АДАМА ЛЬВОВІЧА**; 1541, Камянецкі пав. – 1613), царкоўнага і дзяржаўнага дзеяча Вялікага Княства Літоўскага, пісьменніка-палеміста,

філосафа, багаслова, аднаго з ініцыятараў і арганізатараў Брэсцкай уніі 1596 г.

14 **70** гадоў з дня нараджэння **ВІКТАРА ДЗМІТРЫЕВІЧА НІКІЦІНА** (1951, г. Брэст), заслужанага архітэктара Беларусі

16 **30** гадоў з часу стварэння штомесячнага навукова-метадычнага ілюстраванага часопіса **«ПРАЛЕСКА (ДАШКОЛЬНАЯ АДУКАЦЫЯ)»** (Мінск; 1991)

17 **100** гадоў з дня нараджэння **СОФІІ ПАЎЛАЎНЫ ІВАНОВАЙ** (1921, Украіна), расійскай і беларускай актрысы, заслужанай артысткі Беларусі

17 **85** гадоў з дня нараджэння **МІХАСЯ (МІХАІЛА МІХАЙЛАВІЧА) РУДКОЎСКАГА** (1936, Ганцавіцкі р-н – 1991), паэта, перакладчыка

17 **40** гадоў з часу адкрыцця **ПЕРШАГА ТРАЛЕЙБУСНАГА МАРШРУТА** ў г. Брэсце (1981)

19 **140** гадоў з дня нараджэння **УСЕВАЛАДА МАКАРАВІЧА ІГНАТОЎСКАГА** (1881, Камянецкі р-н – 1931), вучонага-гісторыка, акадэміка АН Беларусі і АН Украіны, першага прэзідэнта АН Беларусі, грамадскага і палітычнага дзеяча

20 **140** гадоў з дня нараджэння **ВАЛЯНЦІНА ВІКТАРАВІЧА ВОЛКАВА** (1881, Расія – 1964), жывапісца, педагога, народнага мастака Беларусі

21 **100** гадоў з пачатку выдання газеты **«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА»** (Мінск; 1921)

22 **60** гадоў з дня нараджэння **АЛЕНЫ БАРЫСАЎНЫ СПІРЫДОВІЧ** (1961, г. Мінск), дыктара беларускага тэлебачання, заслужанай артысткі Беларусі, кавалера ордэна Францыска Скарыны (2016)

23 **135** гадоў з дня нараджэння **ЗМІТРАКА БЯДУЛІ** (сапр. **САМУІЛА ЯФІМАВІЧА ПЛАЎНІКА**; 1886, Лагойскі р-н – 1941), пісьменніка

24 **85** гадоў з дня нараджэння **ВЕРЫ РЫЧ** (1936–2009), англійскай паэтэсы, перакладчыцы, журналісткі, аўтара перакладаў літаратурных твораў беларускіх аўтараў

26 **ДЗЕНЬ ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ ТРАГЕДЫІ** (1986)

26 **35** гадоў з часу здарэння **ЧАРНОБЫЛЬСКАЙ КАТАСТРОФЫ 1986 г.,** адной з найбуйнейшых у свеце тэхнагенных аварый XX ст. (Украіна; 1986)

27 **80** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ ЗАХАРАВІЧА КЕРНОГІ** (1941, г. Баранавічы – 2009), журналіста, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1974)

29 **100** гадоў з дня нараджэння **МІКОЛЫ (МІКАЛАЯ ІВАНАВІЧА) ЕРМАЛОВІЧА** (1921, Дзяржынскі р-н – 2000), вучонага-гісторыка, літаратуразнаўца, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1992)

30 **140** гадоў з дня нараджэння **ЯНКІ ЖУРБЫ** (сапр. **ІВАНА ЯКАЎЛЕВІЧА ІВАШЫНА**; 1881, г. Чашнікі – 1964), паэта,

перакладчыка

30 **120** гадоў з дня нараджэння **САЙМАНА СМІТА КУЗНЯЦА** (сапр. **СЯМЁНА АБРАМАВІЧА КУЗНЯЦА**; 1901, г. Пінск – 1985), амерыканскага вучонага-эканаміста і статыстыка, аднаго з заснавальнікаў эмпірычнай эканомікі і колькаснай эканамічнай гісторыі, члена Нацыянальнай АН ЗША, лаўрэата Нобелеўскай прэміі (1971)

30 **70** гадоў з дня нараджэння **НАТАЛЛІ УЛАДЗІМІРАЎНЫ СУСТАВАЙ** (1951, Германія), кніжнага графіка, аўтара ілюстрацый да многіх дзіцячых кніг

## *МАЙ*

**25** гадоў з пачатку выдання часопіса Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь **«АРМИЯ»** (Мінск; 1996)

1 **СВЯТА ПРАЦЫ**

1 **125** гадоў з дня нараджэння **АДАМА АНТОНАВІЧА САКОЛЬЧЫКА** (1896, Мінскі раён – 1983), бібліёграфа, бібліятэкара, педагога

1 **90** гадоў з дня нараджэння **АЛЕГА АНТОНАВІЧА ЛОЙКІ** (1931, г. Слонім – 2008), пісьменніка, літаратуразнаўца, крытыка, члена-карэспандэнта НАН Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1990)

2 **ВЯЛІКДЗЕНЬ** (па календары праваслаўнай канфессіі)

3 **250** гадоў з дня нараджэння **АЎГУСТА БЕКЮ** (1771, г. Гродна – 1824), беларускага ўрача, педагога, доктара і прафесара медыцыны, доктара філасофіі, які адным з першых у Беларусі і Літве пачаў вакцынацыю супраць воспы

3 **230** гадоў з дня нараджэння **ГЕНРЫКА ЖАВУСКАГА** (1791–1866), польскага пісьменніка, публіцыста, аўтара гістарычных твораў, прысвечаных ВКЛ, стваральніка мастацкіх вобразаў дзеячоў беларускай культуры

3 **230** гадоў з часу прыняцця **КАНСТЫТУЦЫІ 3 мая 1791 года,** асноўнага закона Рэчы Паспалітай (1791–1793), першага ў Еўропе і другога ў свеце (пасля Канстытуцыі ЗША) асноўнага закона, зафіксаванага пісьмова

4 **110** гадоў з дня нараджэння **ПЯТРА РУНЦА** (**ПЯТРА МІКАЛАЕВІЧА**; 1911, Пухавіцкі раён – 1997), пісьменніка, які склаў кнігу дзіцячых успамінаў пра вайну «Ніколі не забудзем» (разам з Я. Маўрам)

5 **ДЗЕНЬ ДРУКУ**

6 **100** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА ТРАФІМАВІЧА СІМУРАВА** (1921, Гарадоцкі раён – 2007), журналіста, пісьменніка, заслужанага работніка культуры Беларусі (1984)

7 **ДЗЕНЬ РАБОТНІКАЎ РАДЫЁ, ТЭЛЕБАЧАННЯ І СУВЯЗІ**

| | |
|---|---|
| **7–13** | **100** гадоў з часу правядзення **ПЕРШАГА УСЕБЕЛАРУСКАГА З'ЕЗДА ПРАФЕСІЙНЫХ САЮЗАЎ** (1921) |
| **8** | **140** гадоў з дня нараджэння **ІААНА РЫЛЬСКАГА** (свецкае імя Іван Дзмітрыевіч Пашын; 1881, Мазырскі павет – 1938), рэлігійнага дзеяча, святога, епіскапа |
| **8** | **70** гадоў з дня нараджэння **ЛЕАНІДА МІХАЙЛАВІЧА РАЦЬКО** (1951, Мінская вобл.), мастака дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (мастацкая апрацоўка металу), дызайнера, жывапісца |
| **9** | **ДЗЕНЬ ПЕРАМОГІ** |
| **9** *(другая нядзеля мая)* | **ДЗЕНЬ ДЗЯРЖАЎНАГА ГЕРБА І ДЗЯРЖАЎНАГА СЦЯГА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ** |
| **9** | **155** гадоў з дня нараджэння **ЛЬВА САМОЙЛАВІЧА БАКСТА** (сапр. **РОЗЕНБЕРГА**; 1866, г. Гродна – 1924), тэатральнага мастака, графіка, кніжнага ілюстратара, жывапісца, адным з вучняў якога з'яўляўся М. Шагал |
| **10** | **90** гадоў з дня нараджэння **СЦЯПАНА ЗАХАРАВІЧА ГАЎРУСЁВА** (1931, Дубровенскі р-н – 1988), паэта, крытыка, перакладчыка, лаўрэата Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова (1987) |
| **10** | **85** гадоў з дня нараджэння **АЛЯКСАНДРА АДАМАВІЧА КРАЎЧУКА** (1936, г. Брэст – 2014), мастака тэатра, педагога |
| **10** | **55** гадоў з часу заснавання вопытнай гаспадаркі **«ПУШЧАНСКАЕ»** на тэрыторыі запаведніка «Белавежская пушча» (1966) |
| **11** | **РАДАЎНІЦА** (па календары праваслаўнай канфесіі) |
| **11** | **70** гадоў з дня нараджэння **МІКАЛАЯ КАНСТАНЦІНАВІЧА ЛІТВІНА** (1951, Баранавіцкі р-н), кампазітара |
| **14** | **355** гадоў з дня нараджэння **КАЗІМІРА АЛЯКСАНДРА ПАЦЕЯ** (1666–1728), дзяржаўнага дзеяча Вялікага Княства Літоўскага |
| **15** | **ДЗЕНЬ СЯМ'І** |
| **15** | **ДЗЕНЬ РАБОТНІКАЎ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ І СПОРТУ** (трэцяя субота мая) |
| **15** | **85** гадоў з дня нараджэння **БАРЫСА ІВАНАВІЧА САЧАНКІ** (1936, Хойніцкі р-н – 1995), пісьменніка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Якуба Коласа (1982), Літаратурнай прэміі імя І. Мележа (1991), кавалера двух ордэнаў «Знак Пашаны», уладальніка медаля Ф. Скарыны |
| **16** | **110** гадоў з дня нараджэння **ВАСІЛЯ ВІТКІ** (сапр. **ЦІМОХА ВАСІЛЬЕВІЧА КРЫСЬКО**; 1911, Слуцкі р-н – 1996), паэта, пісьменніка, крытыка, заслужанага дзеяча культуры Беларусі (1970), лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1972) |
| **17** | **135** гадоў з дня нараджэння **СТАФАНА СТАФАНАВІЧА МАРКОЎСКАГА** (1886–1949), музыканта, педагога, заснавальніка беларускай школы ігры на ўдарных інструментах |
| **17** | **75** гадоў з дня нараджэння **ВАСІЛЯ УЛАДЗІМІРАВІЧА ГАДУЛЬКІ** (1946, Жабінкаўскі р-н – 1993), паэта, педагога |
| **18** | **75** гадоў з дня нараджэння **ІГАРА ВІКТАРАВІЧА ВОЎЧАКА** |

(1946), рэжысёра-мультыплікатара, сцэнарыста, кампазітара, піяніста, заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі

**20** **85** гадоў з дня нараджэння **ПЯТРА ПЯТРОВІЧА СУЦЬКО** (1936, Пружанскі р-н – 2010), журналіста, заслужанага работніка культуры Беларусі

**22** **70** гадоў з дня нараджэння **АНАСТАСІІ ІВАНАЎНЫ ФЯЦІСАВАЙ** (1951, г. Брэст), жывапісца, мастака афармленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (эмаль)

**23** **100** гадоў з часу заснавання **ФУНДАМЕНТАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БДУ** (г. Мінск; 1921)

**24** **85** гадоў з дня нараджэння **КАНСТАНЦІНА ВАСІЛЬЕВІЧА ДРОНЯ** (1936, Пружанскі р-н), паэта

**26** **30** гадоў з часу стварэння **МІЖНАРОДНАЙ АСАЦЫЯЦЫІ БЕЛАРУСІСТАЎ (МАБ)**, грамадскага аб'яднання навуковага і культурна-асветніцкага напрамкаў дзейнасці (Мінск; 1991)

**27** **150** гадоў з дня нараджэння **ІСАКА АБРАМАВІЧА СЕРБАВА** (1871, Слаўгарадскі раён – 1943), этнографа, фалькларыста, археолага, які першы з беларускіх этнографаў стварыў фотатэку, правадзейны член Інбелкульта

**27** **90** гадоў з дня нараджэння **ВАСІЛЯ ПРАКОПАВІЧА ЖУРАЎЛЁВА** (1931, Мсціслаўскі раён), крытыка і літаратуразнаўца, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі імя Якуба Коласа (2002)

**27** **70** гадоў з дня нараджэння **НАТАЛЛІ АЛЯКСАНДРАЎНЫ РУДНЕВАЙ** (1951), артысткі оперы, педагога, народнай артысткі Беларусі, лаурэата тэатральнай прэміі імя Л. Александроўскай (1997), прэміі Беларускага саюза тэатральных дзеячоў «Крыштальная Паўлінка» (2012)

**28** **ДЗЕНЬ ПАГРАНІЧНІКА**

**28** **185** гадоў з дня нараджэння **ЯНА (ІВАНА АЛЯКСАНДРАВІЧА) КАРЛОВІЧА** (1836, Літва – 1903), польскага лінгвіста, этнографа, фалькларыста, музыказнаўца, збіральніка мелодый беларускіх народных песень, складальніка кніг з беларускімі казкамі, легендамі і паданнямі, акадэміка Акадэміі ведаў у Кракаве

**28** **100** гадоў з дня нараджэння **НУТЫ АЎРУМ-ЭЛЬЕВІЧА ШПІГЕЛЬМАНА** (1921–1974), заслужана архітэктара Беларусі, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1968)

**28** **75** гадоў з дня нараджэння **МІХАІЛА ІВАНАВІЧА ДЗЯМЧУКА** (1946, Кобрынскі раён – 2016), вучонага ў галіне прыбора- і машынабудавання, дзяржаўнага дзеяча Беларусі, члена-карэспандэнта НАН Беларусі, заслужанага дзеяча навукі Беларусі, лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1974), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1986)

**28** **65** гадоў з дня нараджэння **МАРЫІ ПЯТРОЎНЫ МАРШАК** (1956, Лунінецкі р-н), спявачкі, салісткі Беларускага дзяржаўнага ансамбля

